# СКАЛАДРОМ, ЭКАСЦЕЖКА, ЛАБІРЫНТ...

## Пазнаёміліся з новымі месцамі адпачынку мінчан

**Па добрай традыцыі штогод у сталіцы да Дня Незалежнасці і Дня горада адкрываюцца новыя рэкрэацыйныя зоны — па адной у кожным раёне. Як правіла, яны ствараюцца з мінімальным прыцягненнем бюджэтных сродкаў, сіламі саміх гараджан, работнікаў арганізацый і прадпрыемстваў. У аб'ездзе такіх месцін на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталляй Качанавай, старшынёй Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімірам Кухаравым, кіраўнікамі адміністрацый раёнаў сталіцы ўзялі ўдзел і карэспандэнты «Звязды».**



Мэр горада Уладзімір КУХАРАЎ падарыў Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ фотаальбом з новымі зонамі адпачынку.

### Ляцім у «Космас»

Зона адпачынку «Космас» у Фрунзенскім раёне была натхнёная дасягненнямі першай беларускай жанчыны-касманаўта Марыны Васілеўскай. Лакацыя пачала афармляцца яшчэ вясной: на рэспубліканскім суботніку тэрыторыю прыводзілі ў парадак больш чым 400 чалавек. Сярод іх — кіраўніцтва і моладзь сталіцы, супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Цяпер тут прыемнае месца для прагулак і не толькі.

На тэрыторыі ўладкавалі пляцоўкі для пікніка з мангаламі, прыгожымі сталамі і спецыяльную сцежку, па якой можна хадзіць басанож. Аматарам актыўнага адпачынку прыйдуцца па душы вулічныя трэнажоры, а сем'і з маленькімі дзецьмі ацэняць гульнявы комплекс у выглядзе ракеты, а таксама вяровачны гарадок з міні-скаладромам. Тут усе ахвотныя змогуць схавацца ад гарачага сонца ў цені дрэў, прагуляцца па гравійнай дарожцы, цікава правесці час з сям'ёй і сябрамі. У лясным масіве ўстаноўлены шэзлонгі, інфармацыйныя стэнды, доўгія драўляныя лавы, якія гарманічна ўпісваюцца ў навакольны пейзаж.

### Трапляем у «Казачны край»

Экасцежка «Казачны край» Першамайскага раёна абсталявана на балоцістай мясцовасці паміж домам № 17 на вуліцы Шугаева і МКАД. На маршруце можна даведацца шмат цікавага пра флору лугоў, балот і лясоў. Інфармацыя размешчана на спецыяльных стэндах. Мясцовую тэрыторыю ўпрыгожылі арт-аб'екты. Дарэчы, ёсць і скульптура лася. Гэта нездарма: рагатыя тут частыя госці.

Адзін з берагоў невялікай сажалкі расчысцілі, стварылі дашчаны насціл і невялікі пірс для рыбакоў, бераг адсыпалі пяском. Як адзначыла Наталля Качанава, для прыгажосці не хапае, каб у вадзе раслі лілеі. Такое ж меркаванне выказала мясцовая жыхарка, якая падышла да ўдзельнікаў аб'езду, каб пахваліць добраўпарадкаванне і падзякаваць за яго. «Мы падзяку ад усіх пенсіянераў напішам. Усяго добрага вам і нашаму Прэзідэнту! Здароўя вам, дзякуй за працу! Мы ў 90-я сталі і не хваляваліся, бунт не ўздымалі, зарплату, бывала, не атрымлівалі, і ўсё нармальна было».

Пенсіянерка распавяла, што працавала на заводзе Кірава. Яна папрасіла старэйшае пакаленне не крыўдзіцца на моладзь, бо апошняя многага не разумее. «Моладзь шмат чаго не разумее сёння. А вы — працуйце, каб яны разумелі, што вайну адстаялі... Мой бацька ваяваў, Беларусь абараняў. І мы — іх дзеці — таксама адстойвалі. Цяпер неабходна ўсё гэта захаваць, даводзіць да маладога пакалення сапраўдную гісторыю, каб тыя жахі вайны больш ніколі не паўтарыліся», — дадала мясцовая жыхарка.

### Па «Шышкі» — у Заводскі раён

Экасцежка «Шышкі» ўпрыгожыла жылы мікрараён Сосны. У лясным масіве ў цені іглічных дрэў уздоўж сцежкі цяпер размяшчаюцца крэатыўныя лаўкі ад прадпрыемстваў раёна, драўляныя скульптуры, кармушкі, пазнавальныя гульні і многае іншае. Па словах кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна Уладзіміра Шыбекі, у першую чаргу пры ўладкаванні экалагічнай сцежкі хацелі, каб яна дапамагала фарміраваць у падрастаючага пакалення паважлівыя і беражлівыя адносіны да прыроды.

Ён распавёў, што побач з «Шышкамі» размяшчаецца сярэдняя школа № 144, якая мае статус «зялёнай школы». Для яе вучняў экасцежка — і месца адпачынку, і тэрыторыя практычных заняткаў. Уладзімір Шыбека анансаваў, што да Дня горада ў Заводскім раёне плануюць падарыць зону адпачынку жыхарам Чыжоўкі. Ён запрашае ўсіх ахвотных паглядзець на тое, чым здзівіць Заводскі раён мясцовых жыхароў.

### Велізарны «Мурашнік» для дзяцей

Ён размяшчаецца ў раёне вуліцы Сярова, стаў месцам прыцягнення ўвагі прадпрыемстваў Кастрычніцкага раёна яшчэ вясной: калектывы выходзілі сюды прыводзіць тэрыторыю ў парадак. Следам за вялікай уборкай — рамонтныя работы, аснашчэнне абсталяваннем. Праявіўшы фантазію, азеляніцелі раёна стварылі крэатыўную прастору: яркі шмат'ярусны лабірынт з металічнымі фігурамі мурашак, арыгінальнымі лаўкамі і арэлямі ўнутры. На бетонных сцены-кветачніцы нанеслі тэматычныя малюнкі, унутры высадзілі мнагалетнікі.

Мясцовыя жыхары распавядаюць: раней тут было запусценне, на пляцоўцы збіраліся толькі аматары моцных напояў, на ёй малявалі графіці, цяпер жа гэта ўпадабанае месца мам з дзецьмі. «Дзівосна, цудоўна! Малайцы, так трымаць, Кастрычніцкі раён!» — падзякавалі мясцовыя падчас прэзентацыі новай лакацыі.

### Змены ў Парку Паўлава

У парку імя Паўлава адпачываць стала яшчэ прыемней і цікавей. Прыродны ландшафт дапоўнілі разнастайным абсталяваннем. Тут рэалізавалі канцэпцыю «Парк для ўсіх». Для аматараў спакойнага адпачынку — лаўкі і лежакі ў экастылі. Шэзлонгаў не вельмі шмат, і гэта нездарма. У Адміністрацыі Маскоўскага раёна падкрэсліваюць: гэта ўсё ж такі парк, а не пляж, але інтарэсы аматараў сонечных ваннаў таксама пастараліся ўлічыць.

Для аматараў экстрэмальных відаў спорту ёсць скейт-пляцоўка. Для юных адпачывальнікаў — велізарны гульнявы комплекс і арэлі. Для тых, у каго ёсць гадаванцы, — пляцоўка для іх выгулу.

### «Водныя прасторы «Дразды»

Іх уладкавалі на супрацьлеглым ад аквапарку «Лебядзіны» беразе вадасховішча. Хоць на першы погляд месца здаецца аддаленым ад гарадскіх аб'ектаў, адпачывальнікі тут таксама ёсць. Некаторыя прыйшлі пешшу праз дамбу. Людзі адзначаюць, што добраўпарадкаваннем задаволеныя. Уздоўж узбярэжжа ўстаноўлены драўляныя альтанкі з абкладзенымі камянямі вогнішчамі.

Побач з імі інфармацыйныя стэнды. На адным сабраны віды рыб, якія водзяцца ў Драздах. Іншы стэнд інфармуе аб птушках, якіх можна сустрэць тут. Яшчэ адзін прысвечаны гісторыі стварэння вадасховішча Дразды, якое ўтварылася ў 1976 годзе.

Да Дня Рэспублікі на ўзбярэжжы таксама ўсталявалі столікі-пні для гульні ў шашкі, пірсы для рыбакоў, арэлі. Абсталявалі і своеасаблівы пункт назірання за прыродай. Мяркуючы, што частка адпачывальнікаў будзе прыбываць сюды на двухколавым транспарце, тут паставілі велапаркоўкі са ствалоў дрэў.

### Сквер Савецкага раёна

Падарункам жыхарам стала добраўпарадкаванне сквера на вуліцы Івана Мележа. Каля ўваходу на спецыяльным стэндзе можна азнаёміцца з біяграфіяй Івана Мележа і самымі вядомымі цытатамі з твораў беларускага празаіка і драматурга. У зялёнай зоне цяпер можна пагуляць у шахматы або шашкі ў цені дрэў за адмысловымі столікамі. Уздоўж дарожак размясціліся крэатыўныя лаўкі ад прадпрыемстваў раёна. На адной з іх, дарэчы, можна заўважыць кнігі Івана Мележа на падлакотніках. Сярод абсталявання — трэнажоры і воркаўт-пляцоўка, лавы-арэлі, дзіцячая пляцоўка. Арыгінальныя дэкаратыўныя элементы — драўляныя скульптуры мядзведзяў і іншых жывёл.



### «Месца сілы» Партызанскага раёна

Яно знаходзіцца ў парку імя Герасіменкі. На працягу трох гадоў у зялёнай зоне рамантавалі дарожкі, сёлета ўстанавілі абсталяванне. Гэта і дзіцячая пляцоўка, і розныя гульні — «Крыжыкі-нулікі», «Адгадай сляды». Ёсць і тэнісны стол. Уздоўж Сляпянскай воднай сістэмы маюцца некалькі шэзлонгаў, лаўкі, вялікія вазоны з раслінамі.

### «Усё для рыбалкі» цяпер ёсць у Ленінскім раёне

Новая зона адпачынку з'явілася на беразе Чыжоўскага вадасховішча з боку вуліцы Малініна. Тут стылізаванае добраўпарадкаванне: пірсы, драўляныя скульптуры і лаўкі ў выглядзе рыб і рыбакоў, ёсць фотазона з рыбаком і русалкай. Маюцца лаўка-трэнажор, месца для пікніка. Для маленькіх наведвальнікаў Зеленбуд Ленінскага раёна ўстанавіў стэнд-пазл, дзе з фрагментаў можна сабраць малюнак рыбы. Зона адпачынку атрымалася пазнавальнай. Азнаёміўшыся са стэндамі, можна даведацца, што тут водзяцца палёўкі, андатры, выдры рачныя, куторы звычайныя, бабры рачныя, а таксама шэсць відаў качак.

### Падводзім вынікі

«Добрая традыцыя ў Мінску — у гэтыя ліпеньскія дні адкрываць новыя зоны адпачынку. Прычым яны добраўпарадкоўваюцца ўласнымі сіламі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля КАЧАНАВА.** — Так паступова прывядзём у парадак усе тэрыторыі. Самае галоўнае — усё робіцца для таго, каб у вялікім мегаполісе людзям жылося камфортна».

Да 3 ліпеня ў гэтым годзе ў кожным раёне горада створана новая зона адпачынку. Усяго іх ужо 54, а да Дня горада стане яшчэ больш. Гараджане цэняць, што сумеснымі намаганнямі ўладкоўваюцца лакацыі для адпачынку. Падчас аб'езду, убачыўшы прадстаўнічую дэлегацыю, адпачывальнікі падыходзілі, каб падзякаваць за выкананую працу.

«Сёння так горача. Бачылі, людзі задаволеныя, што можна выйсці са сваёй кватэры і трапіць у такую камфортную зону, дзе ёсць цянёк, зялёныя насаджэнні, вада, — акцэнтавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Дзякуй усім, хто прымае ўдзел ва ўладкаванні: прадпрыемствам, арганізацыям, жыхарам, якія ўсе разам робяць такую важную справу. Пачатак заўсёды дае суботнік. А потым наводзіцца парадак, устанаўліваюцца малыя архітэктурныя формы. Робіцца ўсё, каб было вельмі камфортна».

**Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** падкрэсліў, што ўсе гэтыя тэрыторыі былі ўладкаваны, зыходзячы з пажаданняў жыхароў, якія ўнеслі прапановы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, плённа працавалі і падказвалі, што ім хацелася б бачыць.

«Прырода падарыла нам прыгожыя месцы, якія трэба трохі дашліфаваць. Гэта і зроблена сёння пры дапамозе людзей, якія пражываюць у гэтых мікрараёнах, грамадскасці, прадпрыемстваў і арганізацый, актыўных жыхароў — сімбіёзу, які дае добры вынік. Мы ўбачылі, што ўсе гэтыя тэрыторыі зроблены якасна і з душой, людзі адказна аднесліся да працы, таму я думаю, што новыя зоны адпачынку стануць паўнапраўнымі ўпрыгажэннямі нашага горада», — адзначыў мэр Мінска.

Ён дадаў, што такія тэрыторыі ўладкоўваюць практычна без прыцягнення бюджэтных сродкаў — за кошт спонсарскай дапамогі, прыцягнення пазабюджэтных сродкаў, работ, што выконваюцца ў ходзе суботнікаў, у якіх удзельнічаюць жыхары горада.

Па словах мэра, аб'езд новых зон адпачынку праводзяць традыцыйна. Гэта, з аднаго боку, магчымасць абмяняцца вопытам паміж раёнамі, а з другога — падзяліцца думкамі, падказаць адно аднаму, чым яшчэ можна дапоўніць тыя ці іншыя лакацыі.

Уладзімір Кухараў распавёў, што некаторыя рашэнні, якія прымяняюцца ва ўладкаванні зялёных зон, будуць узятыя на ўзбраенне і распаўсюджаныя ў Мінску. Напрыклад, у зоне адпачынку «Казачны край», што на вуліцы Шугаева, асвятленне забяспечылі з дапамогай ліхтароў, якія працуюць на сонечнай энергіі. Такі спосаб даў магчымасць абысціся без дарагіх работ па пракладцы кабелю, уладкавання падмуркаў і латкоў.

«Сапраўдныя шэдэўры — лаўкі, якія вырабляюць нашы прадпрыемствы і арганізацыі. Многае было зроблена з падсобных матэрыялаў. Гэтыя вырабы знакавыя. Упэўнены, што яны стануць месцам прыцягнення грамадзян. Любы чалавек зможа зрабіць памятнае фота», — сказаў кіраўнік горада.

Праз усяго толькі два месяцы мінчан чакаюць новыя падарункі. Яшчэ па адной зоне адпачынку адміністрацыі раёнаў сталіцы падораць жыхарам у верасні — да Дня горада.

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Кацярыны УРБАН.**